Выхаванне патрыятызму ў маладога пакалення сродкамі музейнай педагогікі

*Шабан Вячаслаў Лявонцьевіч,*
*настаўнік гісторыі і грамадазнаўства*
*ДУА "Ляснянская сярэдняя школа" Баранавіцкага раёна*

Беларусь – краіна высокай духоўнасці, адкрытасці, бескарыслівасці і ветлівасці. Беларусам у вышэйшай ступені была заўсёды ўласціва любоў да роднай зямлі. Найвялікшай нацыянальнай каштоўнасцю заўсёды быў патрыятызм – любоў да свайго народа, цяга да ўсяго беларускага, неадрыўная прыхільнасць да месца свайго нараджэння, павага да продкаў, традыцый, культуры. Патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення заўсёды з'яўлялася адной з найважнейшых задач школы, бо дзяцінства і юнацтва – самая плённая пара для прывіцця свяшчэннага пачуцця любові да Радзімы.

Усе мы разумеем: патрыятычнае пачуццё не ўзнікае ў людзей само па сабе. Лад жыцця ў сям'і, адносіны ў школьным калектыве – усё гэта фарміруе патрыятызм. У кожнай школе вырашаецца задача па выхаванні ў школьнікаў грамадзянскасці і патрыятызму. Мы выбралі такі шлях: выхоўваць памяццю, сродкамі музейнай педагогікі.



Музейная дзейнасць у школе з'яўляецца важнай часткай школьнага жыцця, эфектыўным сродкам выхавання і навучання, фарміруе пачуццё павагі да мінулага, цэласнае стаўленне да культурна-гістарычнай спадчыны.



26 мая 2023 года ў Дзяржаўнай установе адукацыі "Ляснянская сярэдняя школа" Баранавіцкага раёна ўрачыста адкрыта музейная экспазіцыя "Памяць і боль беларускай зямлі", дзе праходзяць класныя гадзіны, сустрэчы з вязнямі канцлагераў, конкурсы чытальнікаў; пазакласныя мерапрыемствы, прысвечаныя памятным датам і падзеям гісторыі Беларусі.

Музейная экспазіцыя “Памяць і боль беларускай зямлі" створана з мэтай узмацнення работы па ваенна-патрыятычнаму выхаванню сярод навучэнцаў розных узростаў, прывіццю ім такіх якасцей, як мужнасць, адвага, гонар, доблесць, годнасць, абавязак, адказнасць.



З моманту адкрыцця музейнай экспазіцыі галоўнай задачай з'яўляецца патрыятычнае выхаванне школьнікаў на прыкладзе герояў Вялікай Айчыннай вайны, вязняў канцлагераў, ветэранаў працы. Прыкладам мужнасці, адвагі і гераізму для маладога пакалення з'яўляюцца канкрэтныя людзі з іх лёсамі і подзвігамі, якія яны

здзяйснялі. Каштоўныя звесткі, якія даносяць да нас удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны - гэта жывая праўда, і яе трэба не толькі пачуць, але і захаваць для нашчадкаў. Нашы навучэнцы - гэта апошняе пакаленне, якое яшчэ застала ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.



Школьная музейная дзейнасць вядзецца сумесна з Баранавіцкай міжраённай пракуратурай, бібліятэкамі, музеямі ваенна-патрыятычнай тэматыкі, ветэранскай арганізацыяй, ГА “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі”.



Камплектаванне музейнай экспазіцыі "Памяць і боль беларускай зямлі" цесна звязана з тэматыкай музейнай экспазіцыі і ажыццяўляецца ў розных напрамках: работа ў бібліятэках і архівах, сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны і вязнямі канцлагераў і гета,

арганізацыя экспазіцый і экскурсій, супрацоўніцтва з іншымі музеямі ваенна -патрыятычнай тэматыкі.

Музейная работа вядзецца па наступных напрамках:

*Правядзенне ўрокаў мужнасці.* Намі спланаваны і праведзены тэматычныя ўрокі мужнасці: "Дзеці вайны", "Подзвіг невядомага салдата", "Жанчыны на вайне". Гэтыя ўрокі ўздзейнічаюць на дзяцей на эмацыйным узроўні. Многія з іх праведзены як літаратурна-музычныя кампазіцыі.

*Правядзенне сустрэч з вязнямі канцлагераў і гета.* Вядома, самыя адчувальныя вынікі ў рашэнні задач героіка-патрыятычнага накірунку прыносяць менавіта сустрэчы з вязнямі канцлагераў і гета. Адным з найбольш пераканаўчых прыёмаў выхавання грамадзянскіх пачуццяў з'яўляецца азнаямленне навучэнцаў з каштоўнымі дакументамі: лістамі, дзённікамі, успамінамі ўдзельнікаў тых гадоў. Гэтыя сведчанні перадаюць патаемныя думкі людзей, іх пачуцці, перажыванні, надзеі, яны аказваюць дзейсны ўплыў на сучасную моладзь.

*Работа школьнага музея цесна звязана са школьнай праграмай па такіх прадметах як гісторыя і літаратура.* На ўроках гісторыі Беларусі матэрыялы музейнай экспазіцыі выкарыстоўваюцца пры вывучэнні падзей перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Навучальныя экскурсіі ў музеі дапаўняюць і пашыраюць веды дзяцей аб Вялікай Айчыннай вайне і дазваляюць сфарміраваць свае адносіны да гэтай падзеі.



*Пошукава-даследчая дзейнасць школьніка* – асноўная форма краязнаўчай работы на базе музея. Важная ўмова фарміравання любой якасці ў чалавека – актыўны яго самастойны ўдзел у гэтым працэсе: пошук гістарычных звестак аб людзях роднага краю, фотадакументаў, летапісаў. Працуючы з рознымі крыніцамі інфармацыі, навучэнцы самі

фарміруюць свой погляд на розныя падзеі. Па матэрыялах музейнай экспазіцыі навучэнцы пішуць даследчыя работы, сачыненні, эсэ. Дыпломам 2-й ступені ў намінацыі "Лепшы даследчы праект" узнагароджаны Аляксейчык Максім, вучань ДУА "Ляснянская сярэдняя школа" Баранавіцкага раёна. Яго праект прысвечаны даследаванню гісторыі генацыду беларускага народа на прыкладзе канцлагера "Шталаг-337".

*Пастаянна падтрымліваем сувязь* з вязнямі канцлагераў і гета, арганізуем з імі сустрэчы, віншаванні са святамі, аказваем пастаянную дапамогу.

*Праца па добраўпарадкаванні помнікаў*. Сіламі актывістаў музея падтрымліваецца парадак ля помнікаў на тэрыторыі Ляснянскага сельскага савета.



Штогод разам з педагогамі, бацькамі, вязнямі канцлагераў 9 мая, у Дзень Перамогі, сіламі актывістаў школьнага музея праводзіцца ўрачысты мітынг ля помніка загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны, а 22 чэрвеня - Дзень памяці і смутку.



Вынік працы школьнага музея: вучань - актыўны яго стваральнік.

Члены школьнага музея вядуць актыўную работу па захаванні памяці аб абаронцах Айчыны: займаюцца даследчай дзейнасцю, ствараюць дакументальныя фільмы пра ўдзельнікаў вайны, праводзяць урокі мужнасці і памяці.

Школьны музей – гэта не проста спецыфічна аформленая культурна-гістарычная прастора, у якой захоўваюцца дакументальныя і рэчавыя рэліквіі, якія аднаўляюць у сваёй сукупнасці цікавую і яркую гісторыю сваіх мясцін. Ён з'яўляецца сродкам фарміравання лепшых чалавечых якасцяў: грамадзянскасці, патрыятызму, прыстойнасці, сумленнасці, адказнасці, міласэрнасці, якія заўсёды шанаваліся чалавецтвам.